НАВОШТА ПАТРЭБЕН АНКАПСІХОЛАГ? 7

МАШТАБНАЕ МЕРАПРЫЕМСТВА ПА КРАЯЗНАЎСТВЕ 8

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

3 САКАВІКА 2020 г. АЎТОРАК № 42 (29156)

ЦЫТАТА ДНЯ

Юрый КАРАЕЎ, міністр унутраных спраў:

«Збыт і распаўсюджванне наркотыкаў сёння адбываюцца ў асноўным у інтэрнэце. Таму наша ўпраўленне па барацьбе з наркотыкамі ва ўзаемадзеянні з Аператыўна-аналітычным цэнтрам пры Прэзідэнце і Паркам высокіх тэхналогій узмоцнена займаецца інтэрнэт-разведкай. У гэтым мы дамагліся немалых поспехаў. Спыніць дзейнасць сумнеўных інтэрнэт-рэсурсаў мы не заўсёды ў стане, але доступ да іх спыніць можам».

КАРАТКА

• У чатырох раёнах Магілёўскай вобласці пачалася пасяўная.

• «Белпошта» прапануе бясплатна адправіць пашто ўку да 8 Сакавіка.

• Продаж кветак да 8 Сакавіка: ІП рэгістраваць не трэба, а толькі заплаціць адзіны падатак.

• Сярэдні кошт 1 квадратнага метра жылля на другасным рынку Мінска складае $ 1,3 тысячы.

• Методыку распрацоўкі лекаў ад каранавіруса прапануюць фіналісты «100 ідэй для Беларусі».

• Прафіцыт рэспубліканскага бюджэту ў студзені склаў Br0,9 млрд.

• Школа батлейкі пачала працаваць у Гродзенскім раёне.

• ЕС павысіў рызыку захворвання на каранавірус з сярэдняга да высокага ўзроўню.

ISSN 1990 - 763X

«РОБАКРОК» — ГЭТА НЕ ГУЛЬНЯ

Яно і праўда — не гульня. Так называецца гурток робататэхнікі, у якім пад кіраўніцтвам настаўніцы інфарматыкі і матэматыкі Наталлі ЗНАК займаюцца малодшыя вучні 14-й сталічнай гімназіі. Дзеці вучацца ствараць рухомыя мадэлі, адна з якіх, магчыма, праз колькі гадоў стане прататыпам для новага вынаходства.

Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.

Камунальныя стасункі

ПРА ЖАДАННЕ ЗАВАЁЎВАЦЬ КОСМАС

Як у Мінскім раёне вырашаюць праблему з якасцю вады

У беларускіх падземных водаў ёсць адзін істотны недахоп — павышаная колькасць жалеза. Жорсткасць, марганец і нават нітраты — не выключэнне. Сучасныя тэхналогіі з лёгкасцю дапамагаюць ад гэтага пазбавіцца, але і каштуюць немалых грошай. І не кожная мясцовая ўлада імкнецца «ахвяраваць» іх водаканалам дзеля рашэння такіх важных праблем. Але ў нашай гісторыі ўсё наадварот. Гэта гісторыя пра тое, калі ўсё склалася найлепшым чынам, гісторыя аб прафесіяналізме, вечным пошуку і жаданні працаваць. Тая гісторыя, якую хочацца ставіць у прыклад астатнім.

СТАР. 4

Фота Валеры КІСЛАЙ.

Прырода і мы

ГЛАБАЛЬНАЕ ЗМЯНЕННЕ КЛІМАТУ

Пакуль сіноптыкі спрачаюцца, ці ёсць яно насамрэч, у нас знікла зіма. Ці надоўга?

Сярэдняя тэмпература зімы 2019—2020 гадоў у нашай краіне склала плюс 1,5 градуса. Гэта на 5,5 градуса вышэй за кліматычную норму. Як адзначае намеснік начальніка Рэспубліканскага цэнтра гідраметэаралогіі, кантролю радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Святлана КУЗЬМІЧ, такая цёплая зіма на тэрыторыі Беларусі адзначаецца ўпершыню за ўвесь час інструментальных нацыянальных назіранняў (а вядуцца яны ўжо 140 гадоў).

Згодна з нацыянальнай нормай тэмпературы ў халодны перыяд, кліматычная зіма на тэрыторыі нашай краіны так і не надышла. Ва ўсе зімовыя месяцы так і не адбыўся пераход сярэдняй тэмпературы праз нуль у бок паніжэння. На гэты раз мы атрымалі сяроднееўрапейскую зіму, якая адзначаецца плюсавымі тэмпературамі, змешанымі ападкамі ў выглядзе мокрага снегу і дажджу, а таксама поўнай адсутнасцю снежнага покрыва.

ЦІ НЕ САМЫ ЦЁПЛЫ ГОД

Ва ўсе месяцы (акрамя студзеня і ліпеня) мінулага года ў Беларусі назіраліся станоўчыя тэмпературныя анамаліі. Тут жа спецыяліст адзначыла: сярэднегадавая тэмпература склала плюс 8,8 градуса, пры норме плюс 6,7 градуса. Перавышэнне на больш чым у два градусы лічыцца істотнай анамаліяй. На нашай планеце гэта быў амаль самы цёплы год. Цяплей было толькі ў 2016-м.

СТАР. 13

Боегатоўнасць

КЛЮЧ ДА БЯСПЕКІ

Першыя выпрабаванні айчыннай ракеты паспяхова прайшлі ў Беларусі

Фота БелТА.

У Беларусі паспяхова завяршыўся першы этап выпрабаванняў айчыннай зенітнай кіраванай ракеты 9М318 да зенітна-ракетнага комплексу «Бук-МБ». Пра гэта паведаміў старшыня Дзяржаўнага ваенна-прамысловага камітэта Раман ГАЛОЎЧАНКА: «Усе задачы, якія ставіліся, выкананы. Цяпер мы атрымалі неабходны матэрыял, на падставе якога канструктары будуць дапрацоўваць ракету, каб выйсці на наступны этап выпрабаванняў».

Стварэнне беларускай зенітнай кіраванай ракеты — важны этап на шляху рэалізацыі рашэння кіраўніка дзяржавы аб развіцці ракетнага ўзбраення. Першым крокам было стварэнне рэактыўнай сістэмы залпавага агню «Паланэз», другім — беларускага зенітна-ракетнага комплексу «Бук» і ракеты да яго. Што датычыцца ЗРК, то ён быў створаны досыць даўно і ўжо пастаўляецца на экспарт. Але з ракетамі расійскай вытворчасці.

Распрацоўкай беларускай ракеты займалася навукова-вытворчае прадпрыемства «ОКБ ТСП». Доўгі час ішло канструяванне, рабіліся разнастайныя наземныя выпрабаванні. Аднак галоўная праверка працаздольнасці ракеты — гэта калі боепрыпас упершыню падымаецца ў паветра. Такія лётныя выпрабаванні прайшлі на ўчастку ў межах Столінскага раёна Брэсцкай вобласці, Жыткавіцкага і Лельчыцкага раёнаў Гомельскай вобласці — на тэрыторыі былога авіяцыйнага палігона. Яны сталі чарговым важным крокам у развіцці беларускага ракетабудавання.

На першым этапе лётных выпрабаванняў правяралася, як ракета сыходзіць са стэнда. Таксама было вывучана ўздзеянне полымя на суседнюю ракету на стэндзе і ўздзеянне факела на сам стэнд. Былі пацверджаны цягавыя характарыстыкі, апаратура і бартавыя прылады ракеты працавалі ў штатным рэжыме. Самае галоўнае, што было спраўджана на першым этапе, — гэта самаліквідацыя ракеты. Падчас наступнага этапу лётных выпрабаванняў ракету наводзілі на беспілотны лятальны апарат, цэль захоплівалася, а пасля ажыццяўляўся пуск. Ракета тады сышла са стэнда ў штатным рэжыме і праляцела каля 20 км. Пры гэтым сістэмы старту, кіравання, навядзення, захопу і самаліквідацыі працавалі ў штатным рэжыме.

Ракета запускалася без баявой часткі. Аднак прымаліся вельмі сур'ёзныя меры бяспекі — праз тое, што ў Беларусі палігона для прымянення ракет такой далёкасці не існуе. Менавіта таму для выпрабаванняў абралі бязлюдны ўчастак мясцовасці, які раней быў палігонам. Былі спланаваны ўсе неабходныя мерапрыемствы — забяспечаны радыёлакацыйны кантроль, закрытая паветраная прастора, выкананыя нормы пажарнай бяспекі. Усюды было выстаўлена ачапленне, ажыццяўляліся аблёты мясцовасці. Зонай бяспекі быў вызначаны паралелепіпед са старонамі асновы 35 км на 10 км і вышынёй 6 км. Быў усталяваны часовы рэжым выкарыстання паветранай прасторы з поўнай забаронай палётаў у раёне выпрабаванняў. Для страхоўкі былі разгорнутыя зенітна-ракетныя сродкі «Тор-М2», якія ў выпадку малаверагоднай няштатнай сітуацыі павінны былі б уступіць у справу. Сама ракета была абсталявана некалькімі дублюючымі сістэмамі самаліквідацыі. Адзначаецца, што пры правядзенні пускаў ракеты з баявой часткай забеспячэнне бяспекі будзе яшчэ больш жорсткае.

«Фактычна гэта былі першыя пускі, як іх у нас яшчэ называюць, канструктарскія. Канструктар правярае характарыстыкі, закладзеныя разліковым метадам. Гэта досыць важны этап, таму што яму папярэднічала сур'ёзная работа на зямлі — на выпрабавальных стэндах, пры мадэляванні, разліках. Гэтая, ужо эксперыментальная, праверка вынікаў разлікаў прайшла паспяхова. У развіцці беларускага ракетабудавання гэта вельмі сур'ёзны крок, другая важная падзея пасля ўсім вядомага РСЗА «Паланэз». Але тут ракета на парадак больш складаная», — падкрэсліў кіраўнік Дзяржкамваенпрама, перадае БелТА. Раман Галоўчанка адзначыў: у ракету закладзены ўнікальныя характарыстыкі, «пры дасягненні якіх магчымасці ЗРК «Бук» наблізяцца да комплексу С-300 альбо «Пэтрыёт» як па далёкасці выяўлення цэляў (самалёта-знішчальніка на адлегласці 120—130 км), так і па эфектыўным агнявым паражэнні на далёкасці да 70 км». «Яны амаль у два разы пераўзыходзяць тыя, якія ёсць у дзеючых ракетах да гэтага комплексу. Тут і далёкасць сур'ёзна павялічана — да 70 км. Ракета абсталявана актыўнай галоўкай саманавядзення, якая дазваляе, па-першае, вызваляць мэтавыя каналы, а па-другое, дзейнічаць за гарызонтам радыёлакацыі. Гэта робіць комплекс больш манеўраным, дае магчымасць быць больш устойлівымі да масіраваных ракетна-артылерыйскіх удараў саперніка, абстрэльваць большую колькасць цэляў. Ракета вытрымлівае вялікія перагрузкі — гэта закладзена ў яе канструкцыю распрацоўшчыкам», — адзначыў Раман Галоўчанка.

Яна можа паражаць розныя мэты: ад цяжкіх самалётаў, у тым ліку тых, што выкарыстоўваюць тэхналогію «стэлс», да невялікіх дронаў. Пры гэтым плануецца дапрацоўваць механізм навядзення, каб дамагчыся ўсіх характарыстык, якія закладзены ў тэхнічнае заданне. Пускі беларускай зенітнай кіраванай ракеты 9М318 з баявой часткай запланаваны на канец гэтага года. «Цыкл досыць доўгі, але мы і распрацоўшчыкі стараемся як мага хутчэй гэта зрабіць — каб хутчэй выйсці на этап выпрабаванняў з паражэннем практычных цэляў, — заўважыў Раман Галоўчанка. — Пакуль разлічваем на канец 2020 года, але гэта будзе залежаць ад вынікаў апрацоўкі даных, якія атрыманы ў ходзе першых лётных выпрабаванняў, — іх досыць вялікая колькасць. Трэба ўсё прааналізаваць, палічыць, паглядзець, як працуюць усе бартавыя сістэмы, унесці праўкі. Зыходзячы з гэтага могуць карэктавацца і тэрміны завяршэння ўсёй распрацоўкі. Але, натуральна, мы зацікаўлены зрабіць усё як мага хутчэй».

Дзякуючы радыёлакацыйнай станцыі РЛС-150, якая выкарыстоўваецца ў комплексе, і новай ракеце характарыстыкі ЗРК сярэдняй далёкасці набліжаюцца да комплексаў вялікай далёкасці. З такой радыёлакацыйнай станцыяй беларускі «Бук» будзе здольны на адлегласці каля 130 км выяўляць паветраныя цэлі. «З завяршэннем распрацоўкі беларускай ракеты, поўнай лакалізацыі гэта будзе комплекс, які зможа вырашаць практычна ўвесь спектр задач па абароне паветранай прасторы нашай краіны», — сказаў Раман Галоўчанка. Ён дадаў, што пры ўсіх плюсах экспарту ўсё-такі прыярытэт — бяспека нашай краіны, не толькі ваенная, але і тэхналагічная. «Гэта таксама важны элемент. У выпадку абвастрэння любой абстаноўкі вельмі мала будзе ахвотных пастаўляць нейкія элементы, узбраенне. Таму апора на ўласныя сілы — гэта ключ да нашай бяспекі», — падкрэсліў кіраўнік Дзяржкамваенпрама.

Школа актыўнага грамадзяніна

Абараніць прыроду — абараніць Айчыну

Намеснік міністра прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Андрэй ХМЕЛЬ у рамках Школы актыўнага грамадзяніна сустрэўся з дзевяцікласнікамі сталічнай гімназіі № 6.

Намеснік міністра заклікаў удзельнікаў сустрэчы да актыўнага абмеркавання ўсіх хвалюючых падлеткаў тэм і спрэчных момантаў. Многія з іх былі прысвечаны і сферы дзейнасці госця — ахове прыроды. Так, гімназістаў цікавіла, ці могуць знайсці працу ў сістэме Мінпрыроды тыя, хто навучаецца па хіміка-біялагічным профілі, ці з'яўляецца экалагічна чыстай атамная энергетыка, як адносіцца да ГМА-прадуктаў і ці ёсць яны ў Беларусі.

Андрэй Хмель адказаў на ўсе пытанні ўдзельнікаў сустрэчы і адзначыў, што экалагічная бяспека нароўні з ваеннай, эканамічнай, сацыяльнай і іншымі з'яўляецца часткай Канцэпцыі нацыянальнай бяспекі Рэспублікі Беларусь. Таму ўсіх спецыялістаў у гэтай сферы, а таксама актыўных грамадзян, якія ў паўсядзённым жыцці адмаўляюцца ад лішніх рэчаў, сартуюць адходы, выкарыстоўваюць бяспечныя для прыроды матэрыялы, можна назваць абаронцамі Айчыны.

Намеснік міністра таксама расказаў, як сёння ўдасканальваецца дзейнасць Белгідрамета для павышэння якасці прагнозаў надвор'я, дзякуючы чаму развіваецца сістэма электратранспарту ў краіне, як Мінпрыроды кантралюе шкодныя выкіды прадпрыемстваў, падтрымліваецца радыяцыйная бяспека ў сувязі з наступствамі аварыі на Чарнобыльскай АЭС і будаўніцтвам БелАЭС.

— Школа актыўнага грамадзяніна дае магчымасць школьнікам размаўляць на роўных з дзяржаўнымі служачымі, — падкрэсліў Андрэй Хмель. — На такіх сустрэчах мы можам даведацца пра іх праблемы, адказаць на пытанні і даць альтэрнатыўнае меркаванне апроч таго, што яны даведваюцца з сацыяльных сетак, дзе акрамя добрых рэчаў ёсць шмат лішняга. Мы даем магчымасць ім сфарміраваць свой погляд па розных тэмах.

* * *

У рамках адзінага дня інфармавання «Транспартны комплекс Рэспублікі Беларусь: стан і перспектывы яго развіцця» міністр прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Андрэй Худык сустрэўся з педагагічным калектывам і студэнцкай моладдзю Гродзенскага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта. Ён расказаў, што аўтамабілі займаюць лідзіруючае месца сярод крыніц выкідаў шкодных рэчываў у навакольнае асяроддзе. Так, за 2019 год доля выкідаў ад аўтамабільнага транспарту склала больш за 60 % ад усяго іх аб'ёму. Тым не менш дзякуючы рабоце па скарачэнні выкідаў забруджвальных рэчываў ад мабільных крыніц за апошнія 20 гадоў удалося знізіць шкоднае ўздзеянне транспарту на атмасфернае паветра ў краіне.

— У Беларусі на дзяржаўным узроўні выпрацаваны адзіны падыход да развіцця транспартнай галіны: прытрымлівацца балансу паміж эканамічнымі інтарэсамі грамадства, з аднаго боку, і ступенню ўздзеяння на навакольнае асяроддзе з іншага, — падкрэсліў міністр.

Вераніка КОЛАСАВА.
Фота прэс-службы Мінпрыроды.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Сусветныя біржы пайшлі ў рост

Парыжская біржа ў пачатку тыдня адкрылася ростам каціровак, перадае Euronews. Настрой інвестараў, як паведамляецца, палепшыўся пасля таго, як стала вядома, што цэнтрабанкі шэрагу еўрапейскіх краін маюць намер распачаць комплекс мер па падтрымцы эканомікі, аслабленай эпідэміяй каранавіруса. Яшчэ на мінулым тыдні стала вядома, што шкода ад COVID-19 абыдзецца Кітаю ў тры працэнтныя пункты росту ВУП, якія, у сваю чаргу, складаюць 1 % ад росту ўсёй сусветнай эканомікі. Пра гэта заявіў французскі міністр эканомікі Бруно Лё Мэр. Біржавыя паказчыкі мінулай пятніцы, напрыклад у ЗША, сталі найгоршымі за апошнія 12 гадоў. А ўчора сітуацыя змянілася: біржы Шанхая прыўзняліся на 3 %, а такійскі фондавы рынак змог адыграць назад 0,95 %. У Японіі чакаюць інтэрвенцыю ЦБ краіны, кіраўніцтва якога заявіла, што падтрымае стабільнасць фінансавых рынкаў. Еўрапейскія біржы падхапілі вектар азіяцкіх гандлёвых пляцовак. Падобная тэндэнцыя назіралася і ў Расіі. У сваю чаргу, кіраўнік ФРС ЗША Джэром Паўэл заявіў, што мае ўсе магчымасці падтрымаць эканоміку краіны, даўшы зразумець, што можа быць зніжана працэнтная стаўка.

Прэм'ер Ірака адмовіўся ад фарміравання ўрада і адклікаў сваю кандыдатуру

Прызначаны на пасаду прэм'ер-міністра Ірака Мухамед Таўфік Алаўі адмовіўся фарміраваць урад і адклікаў сваю кандыдатуру. Адпаведную заяву распаўсюдзіў яго офіс. Па словах Алаўі, у сувязі з тым, што ў парламенце двойчы не сабраўся кворум, ён «прыносіць свае прабачэнні і адмаўляецца ад далейшага фарміравання кабінета міністраў». Пасля гэтай заявы прэзідэнт Ірака Бархам Салех запатрабаваў ад палітычных партый прадставіць яму на працягу 15 дзён альтэрнатыўную кандыдатуру. «Мы пачынаем кансультацыі па выбары новага кандыдата на пасаду кіраўніка ўрада Ірака», — прыводзіць яго заяву тэлеканал Al Arabiya.

Люксембург стаў першай краінай у свеце з бясплатным грамадскім транспартам

Для паездкі на аўтобусе, трамваі ці цягніку ў гэтай краіне цяпер больш не трэба купляць білет: дастаткова мець пры сабе пасведчанне асобы. Між тым адзначаецца, што ў цягніках усё ж застанецца першы клас, месцы ў якім будуць платныя. Мясцовыя ўлады падкрэсліваюць, што мэта такіх мер заключаецца ў тым, каб жыхары краіны адмовіліся ад асабістага транспарту на карысць грамадскага для зніжэння загружанасці дарог і ўзроўню шкодных выкідаў у атмасферу. Праўда, ёсць адзін важны нюанс — забеспячэнне работы грамадскага транспарту ў Люксембургу будзе ажыццяўляцца цалкам за кошт падаткаплацельшчыкаў. Чакаецца, што кожны год падобны «бясплатны» транспарт будзе абыходзіцца ім прыблізна ў 41 мільён еўра.

На слыху

Галоўны санітарны ўрач Наталля ЖУКАВА:

«Неабходнасці ў абмежавальных мерах няма»

Трое хворых з падазрэннем на каранавірус знаходзяцца ў медустановах Беларусі. Намеснік міністра аховы здароўя, галоўны санітарны ўрач Наталля Жукава паведаміла, што імавернасць наяўнасці ў іх каранавіруснай інфекцыі мае высокую ступень. Пры гэтым суразмоўца паведаміла, што аналізы былі дадаткова накіраваны ў адну з лабараторый Сусветнай арганізацыі аховы здароўя для пераправеркі.

Нагадаем, што першым пацыентам стаў студэнт БНТУ з Ірана, які 22 лютага прыляцеў з Баку ў Мінск. Аб яго станоўчым тэсце Міністэрства аховы здароўя паведаміла 27 лютага. Разам з ім у сталічную інфекцыйную бальніцу даставілі яго дзяўчыну і яе родных.

У суботу ў Міністэрстве аховы здароўя заявілі, што адзін з тэстаў у бацькі дзяўчыны даў сумнеўны вынік. Але клінічнай карціны захворвання ў мужчыны, гэтак жа як і ў самога іранскага студэнта, няма.

А 1 сакавіка **прэс-сакратар Міністэрства аховы здароўя Юлія БАРАДУН** паведаміла, што пад падазрэннем на заражэнне яшчэ адна беларуска. У РНПЦ эпідэміялогіі і мікрабіялогіі тэст віцяблянкі выявіў фрагменты РНК, якія могуць належаць тыпу каранавіруса 2019-nCoV. Тэсты праводзіліся ў межах актыўнага лабараторнага кантролю грамадзян, якія вярнуліся з эпідэміялагічна неспрыяльных раёнаў.

Вядома, што беларуска і двое яе калег прыбылі з Італіі. У сувязі з гэтым іх выклікалі ў медустанову, узялі тэсты і аналізы. Пацыенты былі шпіталізаваны ў Віцебскую абласную клінічную інфекцыйную бальніцу. Зараз іх стан здавальняючы, клінічнай карціны захворвання няма. Пра гэта расказаў **начальнік галоўнага ўпраўлення аховы здароўя Віцебскага аблвыканкама Юрый ДЗЯРКАЧ.**

Наталля Жукава адзначыла, што беларусы часта задаюць пытанні, як можна абследавацца. І нагадала, што мэтазгоднасць абследавання вызначае ўрач. Тэсты неабходна здаваць тым грамадзянам, якія наведвалі эпідэмічна неспрыяльныя краіны (КНР, Італія, Паўднёвая Карэя і Іран) і мелі блізкія кантакты з захварэлымі.

— Тыя, хто прыбывае з неспрыяльных рэгіёнаў, змяшчаюцца ў інфекцыйную бальніцу. І разам з тэстам на каранавірус у іх бяруць аналізы на іншыя рэспіраторныя інфекцыі. Калі аналіз на каранавірус не пацвярджаецца, пацыент накіроўваецца ў кантакт-цэнтр, дзе за ім вядзецца назіранне на працягу 14 дзён, — дадала **начальнік галоўнага ўпраўлення арганізацыі медыцынскай дапамогі, экспертызы, звароту грамадзян і юрыдычных асоб Міністэрства аховы здароўя Алена БОГДАН.**

Наталля Жукава падкрэсліла, што неабходнасці ў абмежавальных мерах пакуль няма, акрамя выездаў арганізаваных груп у КНР, Італію, Паўднёвую Карэю і Іран. Нашэнне масак і выкарыстанне іншых сродкаў аховы яна парэкамендавала ў залежнасці ад стану здароўя. Нагадаем, што здаровым людзям спецыялісты не раяць насіць маскі.

Як адзначыў **прадстаўнік Сусветнай арганізацыі аховы здароўя ў Беларусі Батыр БЕРДЫКЛЫЧАЎ,** пакуль СААЗ не бачыць неабходнасці ў абмежаванні падарожжаў і гандлю. Такія меры ён назваў неэфектыўнымі. А вось меры, якія праводзіць Беларусь па выяўленні інфекцыі, даюць добрыя вынікі. Эксперт падкрэсліў, што ўчора на канферэнцыі Еўрапейскага бюро Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, у якой ад Беларусі ўдзельнічаў міністр аховы здароўя Уладзімір Каранік, былі адзначаны адкрытасць і аператыўнасць беларускай сістэмы аховы здароўя.

Алена КРАВЕЦ.

«Еўрабачанне-2020»

ПОСПЕХ ПРЫVALIЎ

Беларусь прадставіць небанальная песня на роднай мове

У сямнаццаты раз наша краіна адправіць свайго музычнага прадстаўніка на міжнародны песенны конкурс «Еўрабачанне». За гэты час сярод канкурсантаў былі салісты і калектывы, дзяўчаты і хлопцы (дарэчы, паводле статыстыкі, менавіта салістаў-мужчын мы адпраўлялі часцей за ўсё — шэсць разоў). Але ўсяго толькі ў другі раз на конкурсе прагучыць беларуская мова — малады і свежы электронны праект VAL выканае ў Ратэрдаме сваю песню «Да відна», з якой музыкі днямі перамаглі ў нацыянальным адборы.

Гэтым разам арганізатараў адбору як ніколі цягне ўхваліць. Па-першае, за сталую ўжо традыцыю онлайн-трансляцый жывога праслухоўвання, якое сведчыць «ху із ху». Па-другое, за перамену месца дзеяння, якая, магчыма, не паўплывала на вынікі, але дала магчымасць большай колькасці людзей жыўцом убачыць і пачуць, а таксама параўнаць фіналістаў адбору — у 1000-метровым павільёне кінастудыі «Беларусьфільм», дзе адбываўся канцэрт, яблыку доўга давялося б шукаць месца для падзення. Па-трэцяе, за разнастайны і перакананчы склад запрошанага журы, у якое ўвайшлі экс-удзельнікі «Еўрабачання» Дзмітрый Калдун (2007 год), Юрый Селязнёў (бэк-вакаліст у конкурсе 2014 і 2015 гадоў) і ЗЕНА (2019), кіраўнік ансамблю «Камерата» Вольга Вараб'ёва, заснавальнік самага ўплывовага ў свеце блогу пра «Еўрабачанне» Wiwibloggs брытанец Уільям Лі Адамс, грэка-кіпрыёцкі спявак і педагог па вакалу Алекс Панайі, прадзюсар леташняга конкурсу ў Ізраілі, Талі Эшколі з тэлеканала KAN, адказны за найбуйнейшыя забаўляльныя тэлепраекты ў Нарвегіі Сціг Карлсен і прадзюсар і тэлежурналіст Джоана Левіева-Сойер, якая з 2012 года адказвае за «Еўрабачанне» ў Балгарыі. Такім чынам адразу было знятае пытанне аўтарытэту суддзяў: калі гэтыя людзі не разбіраюцца ў сучаснай музыцы, папулярных фарматах і конкурсных тэндэнцыях, то хто?

Важная акалічнасць: кожны з суддзяў асабіста агучыў і пракаментаваў выстаўленыя балы — прычым зрабілі гэта да абвяшчэння вынікаў глядацкага галасавання. І хоць кажуць, што вердыкт журы — сума суб'ектыўных меркаванняў, у беларускіх артыстаў і замежных экспертаў погляды збольшага супалі: найчасцей у тройцы фаварытаў аказваліся стыльны Ян Яраш, небанальныя VAL, высокапрафесійная Настасся Малашкевіч і дынамічная КейСі, любога з якіх было б не сорамна дэлегаваць на «Еўрабачанне».

У галасаванні публікі арганізатары таксама пастараліся ўлічыць усе хібы мінулых гадоў, каб мінімізаваць магчымасць штучнай «накруткі» — з аднаго нумара прымаліся толькі адзін званок і адно СМС за кожнага з фіналістаў. У выніку ў тройку лідараў у гледачоў увайшлі КейСі, VAL і эфектны гурт «Чакрас», які абазначыў унушальную групу падтрымкі актуальнымі маскамі, а песню без слоў упрыгожыў шаманскімі матывамі ад якуцкай выканальніцы Олены Уутай. Зрэшты, усяго гэтага аказалася не тое каб мала, а хутчэй занадта, і перамогу па суме балаў — 10 ад журы і 10 ад гледачоў, дарэчы, гэта цалкам характэрная гісторыя для «Еўрабачання» апошніх гадоў — сталі VAL. «У VAL быў спецыфічны, крэатыўны і, я сказала б, еўрапейскі нумар, — заўважыла **вядучая і спявачка, удзельніца «Дзіцячага Еўрабачання» Хелена МЕРААІ,** — таму абсалютна не дзіўна, што іх адзначылі міжнародныя эксперты».

— У якім стылі мы працуем? У сваім, ён так і называецца — ВЭЛ, Улад і Лера. Мы дагэтуль не верым, што гэта адбываецца з намі! — праз хвіліну пасля заканчэння прамога эфіру **ўдзельнікі праекту VAL спявачка Лера ГРЫБУСАВА і саўндпрадзюсар Улад ПАШКЕВІЧ** прымалі віншаванні сяброў і калег. — Вельмі рады, шчаслівыя і ўдзячныя за падтрымку абсалютна ўсім — і нашаму прадзюсару Андрэю Каліне, за якім мы адчуваем сябе як за каменнай сцяной, і ўсёй камандзе, і, вядома, нашым бацькам... Што адчуваем цяпер? Адначасова радасць і стомленасць. Мяркуем, дні на два з'ездзім некуды ў лес, у вёску ці санаторый, каб адпачыць, а потым з новымі сіламі за працу. Бо ёсць шмат нюансаў, якія трэба ўдасканальваць. Што канкрэтна будзем мяняць, пакуль не ведаем — усім спадабацца немагчыма, але заўвагі прафесіяналаў, безумоўна, улічым.

Музыканты расказалі, што працуюць разам з 2016 года, але спроба выйсці на «Еўрабачанне» для іх першая. Больш за тое, гэта наогул іх першая беларускамоўная песня, якую Мікіта Найдзёнаў напісаў адмыслова для ўдзельнікаў гурта. «Перакладаць на англійскую не будзем, — чуе ў агульным гомане пытанне «Звязды» Улад Пашкевіч, — гэта прынцыповы момант, каб ехаць з песняй на роднай мове».

Нагадаем, «Еўрабачанне-2020» адбудзецца ў Ратэрдаме (Нідэрланды) 12—16 мая гэтага года. Прадстаўнікі Беларусі выступяць у першым паўфінале, але гледачы ў нашай краіне па добрай завядзёнцы ўбачаць у прамым эфіры ўсе тры канцэрты — абодва паўфіналы і фінал.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.
Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

Надвор'е

Свежае паветра з Міжземнага мора

У першай дэкадзе сакавіка прыйдзе красавіцкае цяпло?

Вось і прыйшла вясна каляндарная, гэтым разам з актыўным сонцам і ўпэўненым цяплом. На бягучым тыдні на тэрыторыі краіны чакаецца цёплае і дажджлівае надвор'е, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

Заўтра ўдзень захаваецца ўплыў вельмі цёплых паветраных мас міжземнаморскага паходжання. Тэмпература паветра ўначы складзе ад плюс 3 да плюс 8 градусаў. Удзень будзе 6—13 цяпла, а ў паўднёва-ўсходніх раёнах — ад плюс 14 да плюс 16 градусаў. Пры паўднёвым, паўднёва-ўсходнім ветры пераважна па паўночна-заходняй частцы краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы. Уначы і раніцай па паўднёвым усходзе месцамі магчымы туманы.

Але не трэба чакаць менавіта ў пачатку сакавіка пастаяннага цяпла. Сакавік — месяц зменлівы. А таму ў чацвер, 5 сакавіка, надвор'е ў краіне стане вызначаць халодны атмасферны фронт, які пачне адціскаць цяпло на ўсход кантынента. Паўднёвы вецер зменіцца паўночным, стане значна свяжэй. У многіх раёнах пройдуць дажджы. Тэмпература паветра ўначы складзе ад плюс 2 да плюс 8 градусаў. Удзень будзе 4—9 цяпла, ва ўсходніх раёнах — плюс 10—15 градусаў.

Хто сказаў, што вясной не бывае снегу? Усё хлусня, бывае. Няўстойлівае надвор'е праявіць сябе ва ўсёй красе ў пятніцу. Будзе воблачна з праясненнямі. Уначы і раніцай на большай частцы тэрыторыі Беларусі, а ўдзень месцамі пройдуць кароткачасовыя дажджы, пераважна па захадзе краіны — з мокрым снегам. Уначы і раніцай месцамі чакаецца слабы туман, у заходніх раёнах — слабы галалёд. Тэмпература паветра ўначы знізіцца і складзе ад нуля па захадзе да плюс 7 градусаў па ўсходзе краіны. А ўдзень актыўнае сонца нагадае нам, што прыйшла вясна. Паўсюдна будзе 2—9 цяпла, а па паўднёвым усходзе краіны да плюс 13 градусаў.

Сяргей КУРКАЧ.

Культасвета

Дом для коцікаў

1 сакавіка стартаваў фотаконкурс, абвешчаны Вялікім тэатрам Беларусі. Напярэдадні прэм'еры оперы для дзяцей «Кошчын дом», першыя паказы якой адбудуцца 14 і 15 сакавіка, тэатр прапанаваў усім ахвотным «засяліць» дом сваімі ўлюбёнымі гадаванцамі.

Каб стаць удзельнікам фотаконкурсу, трэба ў тэрмін да 9 сакавіка даслаць здымкі катоў — і не толькі — на адрас parter@bolshoibelarus.by ці размясціць іх у любых сацыяльных сетках з хэштэгам #Кошкиндом. Ужо 10 сакавіка самыя цікавыя здымкі трапяць на віртуальную выстаўку на сайце Вялікага тэатра, дзе за іх можна будзе прагаласаваць, — а траіх пераможцаў конкурсу абяцаюць запрасіць непасрэдна на спектакль.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

ПРА ЖАДАННЕ ЗАВАЁЎВАЦЬ КОСМАС

Выгадная альтэрнатыва

У Мінскім раёне 240 населеных пунктаў, і сёння амаль у 50 з іх ёсць пэўныя праблемы з якасцю вады. У большасці выпадкаў галоўная прычына — павышаная колькасць жалеза, радзей сустракаюцца жорсткасць і нітраты. Яшчэ некалькі гадоў таму такіх праблем у раёне было значна больш, але за апошні час мясцовы водаканал здолеў вырашыць іх у многіх населеных пунктах.

— Мы пачалі самастойна збіраць мабільныя станцыі, якія дазваляюць вырашыць пэўную праблему. Калі б мы выбралі «класічны» варыянт рашэння і будавалі паўнавартасны аб'ект, то гэта б заняло больш часу, — тлумачыць **галоўны тэхнолаг ДП «Водаканал Мінскага раёна» Вольга ЖУК.** — У такім выпадку трэба было б распрацоўваць пэўную дакументацыю, дзе ўвагу ўдзяляюць важным, але не першарадным рэчам — генплану, дарогам, агароджам, кабельным лініям і проціпажарным нарматывам.

Гэта значыць, што на рэалізацыю такога праекта дарагі час будзе затрачаны не толькі з-за працяглай падрыхтоўкі, але і з-за грошай — такія аб'екты каштуюць нямала (мінімум, у тры разы даражэй за мабільную станцыю), а менавіта на рашэнне канкрэтнай праблемы выдаткоўваецца толькі 25—30 % усіх затрат.

— Акрамя таго, якасць вады можа змяняцца, і мабільнасць такой сістэмы дазваляе нам перавезці і падключыць яе да іншай свідравіны, — адзначае спецыяліст.

Сёння ў Мінскім раёне працуюць 26 такіх станцый, яшчэ 12 плануецца ўстанавіць сёлета. У асноўным яны дазваляюць зніжаць узровень жалеза ў вадзе, недзе дзякуючы такім станцыям вырашаюць праблему з нітратамі, а летась першы, і пакуль адзіны, аб'ект па змякчэнні вады запусцілі ў пасёлку Юбілейным. А калі ў нейкім населеным пункце з вадой існуе адразу некалькі праблем, то спецыялісты водаканала будуюць камбінаваныя станцыі. Пры гэтым 90 % усіх работ фактычна выконваюць некалькі чалавек — агульнае кіраўніцтва ажыццяўляюць галоўны інжынер, яго намеснік і галоўны тэхнолаг, а збор абсталявання — слесары ААР.

Выніковыя лічбы

Усё абсталяванне водаканал купляе праз конкурс, а ў якасці «абалонкі» для яго спецыялісты выкарыстоўваюць металічныя кантэйнеры, павільёны над свідравінамі ці манціруюць камеры з жалезабетону. На станцыях абезжалезвання ачыстка вады робіцца па адным і тым жа прынцыпе — кісларод акісляе жалеза. А вось глыбокую ачыстку ўжо выконваюць фільтры, і іх загрузка залежыць ад пэўных характарыстык вады (мутнасці, колеру, паху і г. д.). Усё гэта спецыялісты падлічваюць яшчэ перад тым, як купіць абсталяванне. Выходзіць, што кожная ўстаноўка па-свойму ўнікальная — якасць вады і колькасць жыхароў могуць істотна адрознівацца ў населеных пунктах.

Напрыклад, у Новай Вёсцы пражывае 44 чалавекі, і там у адным літры вады змяшчаецца ажно 1,47 мг жалеза, а вось пасля таго як вада праходзіць праз станцыю, гэты паказчык зніжаецца да 0,14 мг (па правілах колькасць жалеза ў пітной вадзе не павінна перавышаць 0,3 мг. — ***«Зв.»***). У адным з раёнаў Заслаўя такім чынам якасную ваду атрымалі чатыры тысячы спажыўцоў — паказчык жалеза знізілі з 0,97 да 0,11 мг/л. А ў хуткім часе якаснай паслугай забяспечаць увесь горад.

А вось з'яўленню нітратаў у вадзе «спрыяюць» сельскагаспадарчыя ўгоддзі, якія знаходзяцца непадалёку. ў такім выпадку ўжо патрэбна выкарыстоўваць больш дасканалыя тэхналогіі. Выдаляць нітраты дапамагае смала, а звычайную кухонную соль выкарыстоўваюць, каб аднавіць работу фільтраў. Калі раней у вёсцы Цна ў адным літры вады было 99,6 мг нітратаў, то пасля будавання станцыі іх стала толькі 16,89 (норма па правілах — 45 мг/л).

Уласна кажучы, такія ж тэхналогіі выкарыстоўваюць і на станцыі змякчэння ў Юбілейным. І нягледзячы на тое, што паказчык жорсткасці вады быў у межах нормы (7 градусаў жорсткасці), уласнікі кватэр дома ТУ «Юбілейны-2012» пастаянна скардзіліся на якасць гарачай вады. Невялічкая станцыя, якую размясцілі ў падвале дома, дазволіла знізіць паказчык да 1 градуса жорсткасці.

Калі гарыш справай

Сабраць і ўстанавіць такія станцыі — толькі палова справы. Каб яны добра працавалі, іх трэба правільна абслугоўваць — раз ці два на тыдзень спецыялісты выязджаюць на месца, каб выканаць пэўныя работы і зрабіць экспрэс-тэсты для кантролю якасці вады. А поўны аналіз проб хутка будуць рабіць ужо ва ўласнай лабараторыі водаканала, якую плануюць запусціць у гэтым годзе ў Заслаўі.

— Галоўнае для нас — здароўе людзей, менавіта гэта і падштурхнула вырашыць праблему як мага хутчэй. Акрамя часу, мы істотна эканомім сродкі бюджэту і прадпрыемства. Калі людзі атрымліваюць дрэнную ваду, то мы робім для іх зніжкі, арганізуем падвоз вады, — кажа Вольга Васілеўна. — Цяпер у першую чаргу мы хочам пазбавіцца ад нітратаў і ўжо потым паступова вырашаць пытанне з колькасцю жалеза ў вадзе. Аднак дасягнуць такіх поспехаў нам дапамагла і фінансавая падтрымка з боку мясцовых улад.

І калі раней **дырэктар Водаканала Мінскага раёна Дзмітрый ДРОЗД** казаў, што першапачаткова такія станцыі для іх здаваліся своеасаблівымі касмічнымі караблямі, то з цягам часу яны сталі проста спосабам вырашыць пэўную праблему. У аграгарадку Сёмкава ўжо з'явілася першая мабільная станцыя абезжалезвання серыйнай вытворчасці (пасля яе запуску жалеза ў вадзе нават не знайшлі. — ***«Зв.»***) — на прадпрыемстве запусцілі паўнавартасны цэх па іх вырабе. За іх работай ужо будуць сачыць з дыспетчарскага пункту, а для абслугоўвання ствараць спецыяльную сервісную службу, у якую ўжо пачалі набіраць супрацоўнікаў. Гэта значыць, што спецыялісты прадпрыемства цяпер змогуць не проста кансультаваць сваіх калег (якія таксама ўжо пачалі збіраць падобныя ўстаноўкі), а ў перспектыве нават і прадаваць свае станцыі.

— Каб не губляць час, мы плануем адкрыць і ўласнае праектнае бюро. Нягледзячы на тое, што мы не будуем паўнавартасныя аб'екты з генпланам, праект усё роўна павінен быць распрацаваны. Калі звяртаешся па дапамогу да іншых арганізацый, трэба прытрымлівацца пэўных працэдур (напрыклад, правесці конкурс па выбары такой арганізацыі), у выніку рэалізацыя ўсяго праекта займае шэсць ці сем месяцаў, а для будавання станцыі нам патрэбна толькі два тыдні. Дзякуючы ўласным праекціроўшчыкам, мы зноў сэканомім сродкі і зможам вырашыць усе праблемныя пытанні ў раёне да 2025 года, — тлумачыць галоўны тэхнолаг.

А з цягам часу на прадпрыемствы плануюць пачаць выпуск модульных каналізацыйна-помпавых станцый (для перапампоўвання сцёкавых вод), станцый другога пад'ёму (для падачы вады) і зліўных станцый (выкарыстоўваюць на ачышчальных збудаваннях, каб прымаць сцёкі з бочак).

І вось тут ужо можна смела сказаць, што калі поспех прыносіць адна справа, то пачынаеш бачыць выхады і з іншых сітуацый. Аднак прыйсці да гэтага можна толькі ў тым выпадку, калі сапраўды гарыш сваёй справай. І хай у гэтай гісторыі не заваёўваюць космас у літаральным сэнсе, гэта зусім не перашкаджае супрацоўнікам водаканала мець такое жаданне і ствараць свае касмічныя караблі.

Валерыя КІСЛАЯ, фота аўтара.

❍ Даведка

Як паведамілі ў Міністэрстве жыллёва-камунальнай гаспадаркі, забеспячэнне спажыўцоў якаснай пітной вадой да 2025 года — прыярытэтная задача, якую кіраўнік дзяржавы і ўрад паставілі перад галіной водаправодна-каналізацыйнай гаспадаркі. На рэспубліканскім узроўні работа ў гэтым кірунку ажыццяўляецца ў рамках падпраграмы «Чыстая вада» Дзяржпраграмы «Камфортнае жыллё і спрыяльнае асяроддзе» на 2016—2020 гады. За пяцігодку жыхароў у населеных пунктах, дзе паказчык жалеза вышэй за 3 мг/л (улічваючы колькасць спажыўцоў), павінны забяспечыць якаснай паслугай за кошт будаўніцтва не менеш за 500 станцый абезжалезвання.

У ведамстве адзначылі, што летась у краіне было пабудавана 269 такіх аб'ектаў. 225 з іх — у рамках падпраграмы «Чыстая вада», дзевяць — за кошт субвенцый ЧАЭС, пяць станцый з'явіліся дзякуючы міжнародным фінансавым арганізацыям, а 30 установак запусцілі на грошы прадпрыемстваў ЖКГ і мясцовых бюджэтаў. На 2020 год запланавана пабудаваць 275 станцый абезжалезвання, а ўсяго да 2025 года плануюць запусціць яшчэ 856. Акрамя гэтага, у планах да 2025 года — адкрыццё 373 новых свідравін і перападключэнне 187 населеных пунктаў да існуючых сістэм цэнтралізаванага водазабеспячэння вадой, якая адпавядае нарматывам якасці.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Зялёныя гарады

ПОЛАЦКАЕ СВЯТЛО

для прыгажосці і эканоміі

Каля 2000 святлодыёдных свяцільнікаў, 12 свяцільнікаў сонечнай энергіі, дэкаратыўная падсветка лесвіцы да Сафійскага сабора і моста праз Заходнюю Дзвіну... За пяць гадоў у межах праекта «Гарсвятло» ў Полацку мадэрнізавалі асвятленне 28 вуліц і 26 гарадскіх аб'ектаў, сярод якіх дамы і помнікі.

АЎТАНОМНЫЯ ЛІХТАРЫ І СМАРТ-СІЦІ

Сёлета горад збіраецца скараціць выкіды вуглякіслага газу прыкладна на 120 тон у год, запэўніў **старшыня Полацкага райвыканкама Ігар МАРКОВІЧ:**

— Падчас рэалізацыі праекта мы праводзілі Дні энергіі, апытанні, у якіх паўдзельнічала звыш 10 тысяч людзей. У 2016-м мы падабралі групу з больш як 40 студэнтаў, якая пад кіраўніцтвам вядомых архітэктараў краіны падрыхтавала крэатыўныя рашэнні для асвятлення вуліц. І наш сумесны праект стаў удалым стартам для маштабнай мадэрнізацыі вулічнага асвятлення.

На рэалізацыю праекта ў Полацку Еўрапейскі саюз выдаткаваў 1,6 мільёна еўра.

— Развіццё «зялёнай» эканомікі і папярэджанне змянення клімату — важная тэма для еўрапейцаў. Беларусь — наш сусед, і для нас важна ўцягваць яе ў гэты праект. Вось чаму мы фінансуем падобныя мерапрыемствы,— патлумачыў **Дзірк ШУБЕЛЬ, кіраўнік Прадстаўніцтва Еўрапейскага саюза ў Беларусі.** — У Бруселі было адабрана пяць гарадоў для падтрымкі мадэрнізацыі інфраструктуры: Браслаў, Чавусы, Полацк, Ашмяны, Бяроза. Полацк знаходзіцца ў авангардзе еўрапейскіх праектаў у Беларусі, і я ўпэўнены, што гэта не апошняе мерапрыемства падобнага кшталту.

Кіраваць вулічным асвятленнем у Полацку спецыялісты цяпер могуць з любой прылады, прычым запальваць ці выключаць ліхтары на вуліцы ў выбраны час можна не цалкам, а кожны паасобку. Святлодыёдныя свяцільнікі дазваляюць штогод эканоміць 265 МВт·г электраэнергіі.

— Сучаснае асвятленне — гэта не толькі эканомія, але і зручнае, камфортнае жыццё, калі можна бяспечна пераходзіць вуліцу і проста прыемна шпацыраваць па ёй. Гэта дакладна змяняе жыццё горада да лепшага, — запэўніў **Сяргей ЛЕЙЧАНКА, першы намеснік старшыні Полацкага райвыканкама.** — Мы сёння шмат гаворым пра смарт-сіці. Святло і мабільнасць — два канькі, на якіх мы намагаемся ўехаць у «разумны» горад для працы і жыцця. Да гэтага мы і рабілі наша асвятленне. І яно падабаецца і нашым жыхарам, і турыстам.

СУЧАСНЫЯ ЗАДАЧЫ СВЯТЛОДЫЁДАЎ

У Полацку засталося аздобіць сучасным святлом яшчэ 320 вуліц, і тут упэўнены, што з гэтай задачай справяцца. Да ўдзелу ў праекце мясцовыя ўлады актыўна падцягваюць і бізнес. Назіраючы, як выглядае святлодыёднае асвятленне, многія бізнесмены ўпрыгожылі вітрыны дэкаратыўным падсвечваннем, зразумеўшы, што прыгожае святло — такі ж рухавік продажу, як і рэклама.

Вельмі добра, што ўсе беларускія гарады, што далучыліся да Пагаднення, уключылі ў свае планы па ўстойлівым энергетычным развіцці і клімаце мерапрыемствы па энергаэфектыўным развіцці вулічнага асвятлення. Гэта сведчанне таго, што мясцовыя ўлады дакладна бачаць рэзерв для эканоміі энергіі і павышэння эфектыўнасці. Праўда, Беларусь яшчэ толькі на пачатку гэтага шляху, лічыць **Іван ФІЛЮЦІЧ, кансультант па энергетычнай эфектыўнасці праекта ПРААН-ГЭФ-Мінпрыроды:**

— Па ўсёй Беларусі працуе 600—700 тысяч святлапунктаў, з іх толькі 10—12 % — сучасныя свяцільнікі. Каб давесці параметры вулічнага асвятлення да сучасных, спатрэбіцца 150—200 мільёнаў долараў. Пры гэтым праекты павінны рэалізоўвацца комплексна, не расцягваючыся на 5, 7, 10 гадоў. Значыць, неабходна разавае прыцягненне досыць вялікіх рэсурсаў, адыход ад традыцыйных крыніц фінансавання і пошук альтэрнатыўных інструментаў.

Прынамсі, гэта грошы міжнародных фінансавых арганізацый, якія гатовы працаваць з праектамі, аднак іх неабходна зацікавіць якаснай перадпраектнай падрыхтоўкай. Пры гэтым перавод вулічнага асвятлення на сучасны варыянт дазваляе вельмі хутка акупіць праект.

Ірына СІДАРОК, фота аўтара.

ЧЫСТА ТАМ, ДЗЕ НЕ ЗАБРУДЖВАЮЦЬ

Як аналітычны кантроль дапамагае выяўляць парушальнікаў прыродаахоўнага заканадаўства

Наколькі спрыяльны стан навакольля для чалавека і іншых жывых істот, ці не шкодзіць прамысловасць прыродным сістэмам? Пошук адказаў на гэтыя і іншыя пытанні — штодзённы клопат спецыялістаў Рэспубліканскага цэнтра аналітычнага кантролю ў вобласці аховы навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

Вядучы інжынер-хімік Кацярына ДАЎГУН тлумачыць: каб аналіз быў дакладным, важна правільна размясціць пробы ў спектрафатометры.

Прырода сцёкаў

Разам з інжынерам-хімікам першай катэгорыі Веранікай Габец **і вядучым інжынерам-хімікам лабараторыі аналітычнага кантролю якасці вод і забруджвання зямель Аляксандрам СІДЛЯРОНКАМ** накіроўваемся на паўднёвы захад сталіцы. У раёне вуліцы Сямашкі знаходзіцца адзін з 19 выпускаў сцёкавых вод «Захад», «Паўднёвы захад», за якія адказвае прадпрыемства «Гаррэмліўнесцёк». Праз яго сістэму па дажджавых калектарах збіраюцца вытворчыя і паверхневыя сцёкавыя воды, ачышчаюцца і выпускаюцца ў прыродныя аб'екты — напрыклад, у раку Мышку.

Каб вызначыць, наколькі чыстыя гэтыя воды, спецыялісты бяруць пробы на выпуску, а таксама на самой рацэ — вышэй і ніжэй па цячэнні. Пазней іх трэба будзе праверыць у лабараторыі на ўтрыманне шкодных рэчываў.

— Вельмі часта ў пробах прысутнічаюць нафтапрадукты — яны трапляюць у сцёк з дарог і аўтастаянак пры раставанні снегу ці моцных дажджах, калі ачыстка працуе горш, — расказвае ўжо па дарозе ў РЦАК Аляксандр Сідляронак.

Праліць святло... на метал

— Адбор проб і правядзенне вымярэнняў у вобласці аховы навакольнага асяроддзя ажыццяўляюцца па абласных заяўках ці Мінскага гарадскога камітэта прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, — знаёміць нас з нюансамі работы **загадчык лабараторыі аналітычнага кантролю якасці вод і забруджвання зямель Аксана САРОКІНА.** — На іх аснове складаюцца паўгадавыя планы-графікі па адбору проб. У спісы ўваходзяць прадпрыемствы, якія маюць скіды са сваіх ачышчальных збудаванняў у вадаёмы і рэкі, а таксама водныя аб'екты, схільныя да замораў.

Рэагуюць спецыялісты і на звароты грамадзян і юрыдычных асоб. Так дзейнічаюць усе 22 акрэдытаваныя лабараторыі РЦАК у краіне.

Аксана Анатолеўна праводзіць нас у адно з памяшканняў лабараторыі, дзе праводзіцца вызначэнне цяжкіх металаў у вадкай і цвёрдай матрыцах на атамна-абсарбцыйным спектрафатометры. На гэтым прыборы працуе вядучы інжынер-хімік Кацярына Даўгун — спецыяліст з вялікім вопытам працы на гэтым апараце. Яна расказвае, што, каб вызначыць, ці ўтрымлівае проба шмат шкодных рэчываў, трэба спачатку падрыхтаваць яе. Гэта вельмі працяглы і працаёмкі працэс, які часам займае некалькі дзён. Пасля падрыхтоўкі пробы яна змяшчаецца ў атамна-абсарбцыйны спектрафатометр, дзе адбываецца яе высокатэмпературная апрацоўка. Увесь працэс, які адбываецца ўнутры прыбора, адсочваецца відэакамерамі, што там знаходзяцца, і праз спецыяльнае праграмнае забеспячэнне перадаецца на манітор. Так паступова вызначаюцца ўсе неабходныя паказчыкі і затым суадносяцца з нарматывамі. Калі апошнія не выконваюцца, спецыялісты РЦАК ва ўстаноўленыя тэрміны інфармуюць пра гэта камітэты, якія далей разбіраюцца ў сітуацыі.

Лабараторыя на колах

У выпадку інцыдэнта ці аварыі, што звязаны з забруджваннем водных аб'ектаў, часта патрабуецца рэагаваць імгненна, каб прадухіліць негатыўныя наступствы. Калі яны здараюцца, спецыялісты Цэнтра выязджаюць на аб'екты ў складзе аператыўнай групы разам з інспектарамі і прадстаўнікамі іншых дзяржслужбаў.

У канцы мінулага года ў РЦАК з'явілася мабільная лабараторыя. Цяпер з яе дапамогай спецыялісты могуць рабіць аналізы проб адразу на месцы — вынікі па адным паказчыку вядомыя ўжо праз 15—20 хвілін. Гэта дазваляе аператыўна вызначыць маштабы аварыі і пачаць прымаць меры для выратавання вадаёму.

Выкарыстоўваюць мабільную лабараторыю і для папярэджання гібелі рыбы. Супрацоўнікі РЦАК абследуюць водныя аб'екты і вызначаюць, ці ёсць фактары, якія правакуюць заморы. Такое «дзяжурства» праходзіць штогод з 1 студзеня да 1 красавіка і з 15 чэрвеня па 20 жніўня з улікам надвор'я.

— Сёлета зімой амаль усе вадаёмы адкрытыя, таму заморных з'яў не назіраецца, — кажа загадчык Аксана Сарокіна. — Нягледзячы на гэта, мы перыядычна выязджаем на водныя аб'екты, мераем растворы кісларод, тэмпературу і празрыстасць вады. Часам на дрэнны стан вадаёмаў уплываюць не толькі ўмовы надвор'я, але і дзейнасць прыродакарыстальніка — напрыклад, арганізацыі ЖКГ, ачышчальныя збудаванні якіх дрэнна працуюць.

У 2019 годзе спецыялісты РЦАК абследавалі 287 водных аб'ектаў, схільных да заморных з'яў, — у 149 выпадках гідрахімічны рэжым не адпавядаў нарматывам якасці паверхневых вод.

Лічбы і факты

За мінулы год лабараторыямі Цэнтра было выканана больш за 208 тысяч аналізаў на ўтрыманне забруджвальных рэчываў у прыродных асяроддзях на 11 тысячах аб'ектах негатыўнага ўздзеяння на навакольле розных прыродакарыстальнікаў. Было выяўлена 713 фактаў невыканання нарматываў: 259 — скідаў у водныя аб'екты, 156 — выкідаў са стацыянарных крыніц, 268 — па землях (уключаючы глебы).

Як расказала **начальнік аддзела арганізацыі аналітычнага кантролю РЦАК Святлана ЦЫКУНОВА**, часта прычынай забруджвання вадаёмаў становіцца зношанасць ачышчальных збудаванняў — менавіта на прадпрыемствах ЖКГ фіксаваліся перавышэнні гранічна дапушчальных канцэнтрацый у пяць і больш разоў.

Не абышлося ў 2019 годзе і без аварыйных сітуацый, звязаных з забруджваннем паверхневых вод і зямель і масавай гібеллю рыбы, — усяго па ўсёй краіне было здзейснена 75 выездаў. Так, напрыклад, у выніку несанкцыянаванага скіду гноеўтрымліваючых сцёкавых вод у меліярацыйны канал шкодныя рэчывы ў высокіх канцэнтрацыях трапілі ў ручай Гарадзянец і Заходнюю Дзвіну. Паводле даных Віцебскага абласнога камітэта прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, агульная сума прычыненай шкоды ў выніку аварыі склала 424 рублі. Яшчэ 1275 рублёў склаў штраф, які атрымалі вінаватыя асобы.

* * *

На жаль, ад дзейнасці чалавека прырода церпіць у розных кутках нашай краіны. І каб зменшыць шкодны ўплыў, трэба падключацца як спецыялістам, так і простым грамадзянам. Бо ад своечасовага выяўлення праблемы часта залежыць жыццё і здароўе соцень жывых арганізмаў.

Веранiка КОЛАСАВА.
Фота Таццяны ТКАЧОВАЙ.

Каб вызначыць, наколькі чыстыя сцёкавыя воды, спецыялісты бяруць пробы на выпуску, а таксама на рацэ — вышэй і ніжэй па цячэнні.

Блонский сельский исполнительный комитет Пуховичского района Минской области проводит повторно открытый аукцион по продаже земельного участка в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов гражданам Республики Беларусь, который состоится 17 марта 2020 г. в 15.00 в зале заседаний сельисполкома, расположенном по адресу: Минская область, Пуховичский район, аг. Блонь, ул. Садовая, 4А, контактные номера: 8 (01713) 44-041, 44-645, 44-455, эл. адрес: blonselisp@tut.by

